**Вучэбная дысцыпліна «Сусветная дзіцячая літаратура»**

| | |
|---|---|
| **Месца дысцыпліны ў структурнай схеме адукацыйнай праграмы** | Адукацыйная праграма бакалаўрыята (агульная вышэйшая адукацыя) Спецыяльнасць: 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя. Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская) Цыкл спецыяльных дысцыплін: кампанент установы вышэйшай адукацыі Модуль «Асновы літаратурнай адукацыі» |
| **Кароткі змест** | Дзіцячая літаратура як мастацтва слова. Міфы народаў свету ў дзіцячым чытанні. Вусная народная творчасць для дзяцей і ў дзіцячым чытанні. Узнікненне і развіццё дзіцячай літаратуры. Станаўленне беларускай дзіцячай літаратуры. Жанр казкі ў сусветнай літаратуры для дзяцей. Аповесць і апавяданне пра дзяцей у сусветнай літаратуры. Навукова-пазнаваўчая кніга для дзяцей. Паэзія для дзяцей. Дзіцячая драма. Дзіцячая перыёдыка. Жанр ілюстрацыі ў дзіцячай кнізе. Айчынная дзіцячая літаратура ХХ стагоддзя. Дзіцячая літаратура на сучасным этапе: проза, паэзія, драматургія. |
| **Фарміруемыя кампетэнцыі, вынікі навучання** | У выніку паспяховага засваення дысцыпліны студэнт павінен: ***ведаць***: спецыфіку, функцыі і перыядызацыю сусветнай і айчыннай дзіцячай літаратуры; светасузіральніцкія і фармальныя асаблівасці дзіцячай літаратуры; узроставую спецыфіку і розных жанраў дзіцячай літаратуры; прынцыпы і прыёмы аналізу твораў; ***умець***: выяўляць мастацкі і педагагічны патэнцыял твораў дзіцячай літаратуры; аналізаваць іх у адзінстве зместу і формы; ацэньваць пазнавальны, выхаваўчы, эстэтычны патэнцыял дзіцячай кнігі; прымяняць атрыманыя веды пры вырашэнні педагагічных, вучэбна-выхаваўчых і навукова-метадычных задач з улікам узроставых і індывідуальных адрозненняў вучняў, іх сацыяльна-псіхалагічных асаблівасцей; ***валодаць***: навыкамі філалагічнага аналізу мастацкага тэксту; уменнямі аналізаваць гісторыка-літаратурны і тэарэтыка-літаратурны матэрыял, выяўляць яго адукацыйны і псіхолага-педагагічны патэнцыял.<br>Патрабаванні да прафесійнай **кампетэнтнасці** спецыяліста: СК-5. Характарызаваць асноўныя тэндэнцыі развіцця дзіцячай літаратуры, абапіраючыся на знакавыя літаратурныя творы для дзяцей. |
| **Прэрэквізіты** | Вусная народная творчасць. Гісторыя замежнай літаратуры. Гісторыя рускай літаратуры. Гісторыя беларускай літаратуры. Уводзіны ў літаратуразнаўства. |
| **Працаёмкасць** | 3 заліковыя адзінкі, 98 акадэмічных гадзін, з іх 58 аўдыторных: 28 гадз. лекцый (з іх 6 КСР) і 28 гадз. практычных заняткаў. |
| **Семестр(ы), патрабаванні і формы бягучай і прамежкавай атэстацыі** | 3 семестр, калоквіум, тэст, залік |